***А.М. Емялёва,*** *ст. выкладчык*

# АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ ВАКАЛЬНА-ХАРАВОГА НАВУЧАННЯ Ў XIX ст. У ВІЦЕБСКУ

Сістэма музычнага выхавання ў Беларусі мае даўнія традыцыі, знаёмства з якімі можа значна пашырыць нашы веды і дазволіць развіваць прынцыпы выхавання на аснове пераемнасці гэтых традыцый. У дадзеным выпадку разглядаецца пераемнасць двух тыпаў – унутраная (айчынная, нацыянальная) і знешняя, якая абапіралася на дасягненні заходнееўрапейскіх і рускіх традыцый у галіне музычнага выхавання. Пераемнасць першага тыпу выяўляецца ў развіцці вакальнай тэхнікі, беражлівых адносінах да нацыянальных асаблівасцей выканання, чуллівым падыходзе да выканання мастацкіх задач, увагі да фізіялагічных асаблівасцей голасу, тэхнічным яго ўдасканаленні. Другі тып пераемнасці грунтуецца на вышэйпералічаных прынцыпах, якія пераводзяцца на айчынную “глебу” і трансфармуюцца ў сувязі з мясцовымі асаблівасцямі.

Як засвойваліся і развіваліся вышэйадзначаныя прынцыпы, прапануем разгледзець на прыкладзе музычнага выхавання навучэнцаў ва ўстановах двух тыпаў – свецкіх і культавых. У Віцебскім духоўным вучылішчы ў сярэдзіне XIX ст. выкладаннем музычна-харавых дысцыплін займаўся С.Я.Вараб’ёў, а ў свецкіх школах і гімназіях спевы выкладаў М.В.Анцаў.

Славуты дзеяч Беларусі М.В.Анцаў (1865–1945) у канцы XIX ст. пасля заканчэння Пецярбургскай кансерваторыі (1894) пераехаў у Віцебск. Тут ён праводзіў актыўную кампазітарскую і музычна-педагагічную дзейнасць, выступаў як музычны і тэатральны крытык. М.В.Анцаў – аўтар хароў, рамансаў, п’ес для фартэпіяна, скрыпкі і інш.

Пры выкладанні спеваў настаўнік імкнуўся выхаваць у навучэнцаў цікавасць да музычнага мастацтва, выпрацаваць у іх добры густ, навучыць чыстаму інтанаванню. Перш за ўсё ён звяртаў увагу на двухгалосныя і шматгалосныя спевы, якія спрыялі развіццю голасу, слыху, памяці, рытму, самастойнасці і ўпэўненасці ў асабістых сілах, што павінна было садзейнічаць жаданню займацца музыкай і спевамі.

М.В.Анцаў прапаноўваў падзяліць працэс навучання ў школах на тры этапы: першы – вызначэнне музыкальных здольнасцей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучэнцаў, зацікаўліванне іх музычным мастацтвам. Пры гэтым настаўнікам выкарыстоўваўся добра знаёмы дзецям музычны матэрыял, які вывучаўся на слых. Другі этап прысвячаўся азнаямленню вучняў з двухгалоснымі спевамі, перад гэтым абавязкова вывучаліся каноны. На дадзеным этапе М.В.Анцаў лічыў неабходным даваць вучням веды аб дыханні, дыкцыі і артыкуляцыі. На трэцім этапе вучні павінны былі авалодаць навыкамі двухгалосных спеваў і выконваць дастаткова складаныя творы. М.В.Анцаў надаваў увагу таксама авалодванню ведамі ў галіне выканаўства і кіравання харавым калектывам. Ён выступаў за індывідуальны падыход да кожнага навучэнца і лічыў, што атрыманне тэарэтычных ведаў з ранняга ўзросту станоўча ўплывае на фарміраванне ў вучняў цікавасці да музыкі. Таму выкладчык павінен ужываць на ўроках толькі высокамастацкі матэрыял. Тэарэтычныя веды, на яго думку, трэба атрымліваць толькі ва ўзаемасувязі з музычным тэкстам. Рэкамендацыі М.В.Анцава знайшлі ўвасабленне ў выданні “метадычных хрэстаматый”, меладычных практыкаванняў, тэарэтычнай рабоце “Нотная тэрміналогія” і іншых працах, якія былі накіраваны на развіццё метрарытму, ладавага слыху, правільнага інтанавання.

Цікавыя прапановы наконт паляпшэння стану музычнага выхавання былі і ў настаўніка духоўнага вучылішча г. Віцебска С.Я.Вараб’ёва, які таксама быў вельмі таленавітым майстрам сваёй справы. Ён валодаў высокаразвітым густам і перадаваў вучням любоў да строгага стылю царкоўных спеваў. С.Я.Вараб’ёў ведаў у дасканаласці стыль кансананснай дыятанічнай сістэмы спеваў і старажытныя царкоўныя напевы. З яго меркаваннем і густам пры перакладзе распеваў лічыліся нават знакамітыя кампазітары XIX ст., якія пісалі духоўную музыку. Нядзіўна, што і хор пад кіраўніцтвам гэтага таленавітага настаўніка дасягнуў высокага майстэрства і ў далейшым стаў узорным.

Прынцыпы музычнага выхавання, якіх прытрымліваўся С.Я.Вараб’ёў, шмат у чым паходзілі на музычна-педагагічныя прынцыпы М.В.Анцава. Яны прадугледжвалі магчымасць навучання спевам усіх вучняў без выключэння, якія праз месяц заняткаў пачыналі добра спяваць, а некаторыя нават выконвалі партыю дысканта або альта на клірасе. Нярэдка можна было пачуць, як вучні ў вольную часіну з захапленнем спявалі любімыя песнапенні, чаго раней не назіралася.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

С.Я.Вараб'ёў, як і М.В.Анцаў, прытрымліваўся трохступеннай паслядоўнасці ў навучанні спевам. На першай ступені праходзіў адбор вучняў у адпаведнасці з іх здольнасцямі. З гэтых навучэнцаў арганізоўваўся хор, які спачатку спяваў унісонам, а потым падзяляўся на галасы, у выніку чаго слых астатніх дзяцей паступова прывучаўся да спеваў. Другая ступень прадугледжвала падключэнне менш здольных вучняў да хору "выбраных". Асаблівая ўвага пры гэтым надавалася пэўнасці голасавядзення і артыкуляцыі. Трэцяя ступень уключала спяванне з "падводкай", да якога паступова далучалася ўсё большая колькасць жадаючых з хору.

Дзякуючы гэтай сістэме, сутнасць якой заключалася ў паступовым пераходзе ад агульнага да падрабязнага, ад простага да складанага, усе вучні мелі магчымасць авалодваць тэхнікай спеваў. Музычны рэпертуар у працэсе навучання прапаноўвалася ўводзіць па ступені складанасці: спачатку простыя і лёгкія песнапенні, потым, калі вучні звыкаліся з голасавядзеннем і маглі вольна валодаць тэкстам, больш складаныя.

Заняткі спачатку праводзіліся з голасу, па слыху. Галоўная ўвага накіроўвалася на пастаноўку голасу, выхаванне музычнага слыху і якаснае інтанаванне, што, зразумела, палягчала далейшае навучанне па нотах. У навучанні вучняў былі выкарыстаны індывідуальны і дыферэнцыраваны падыходы. Настаўнік павінен быў сачыць за гучнасцю выканання і не дапускаць фарсіраванага гуку, які мог шкодна ўздзейнічаць на несфарміраваныя дзіцячыя галасы.

Такім чынам, становіцца відавочнай агульнасць прынцыпаў музычнага выхавання навучэнцаў, якія выкарыстоўвалі знакамітыя дзеячы Віцебска ў XIX ст. М.В.Анцаў і С.Я.Вараб'ёў. Музычна-педагагічныя прынцыпы славутых выкладчыкаў знаходзяць свой працяг, захоўваюць актуальнасць і ў сучаснай практыцы выхавання прафесійных музыкантаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Арнольд, Ю.* Теория древнерусского церковного и народного пения на основании автентических трактатов и акустического анализа / Ю.Арнольд. – М., 1880.

2. *Беларуска-рускае* культурнае ўзаемадзеянне канца XIX – пачатку XX ст. – Віцебск, 1995.

3. *Вопросы* фольклорного творчества, искусства и педагогики. – Л.; М., 1973.

4. *Музыкально-педагогические* взгляды и деятельность М.В.Анцева (из истории музыкального воспитания в Белоруссии): метод. рекомендации / сост. В.В.Ковалив. – Мн., 1990. – 26 с.

5. *Полоцкие* епархиальные ведомости. 1896. 1897. 1898. 1899.

6. *Потулов.* Руководство к практическому изучению древнего богослужебного пения / Потулов. – М., 1872.

7. *Сапунов, А.* Историческая записка 75-летия Витебской гимназии / А.Сапунов. – Витебск, 1884.

8. *Сапунов, А.* Полоцк, Витебск и Минск в 20-х годах прошлого века / А.Сапунов. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1901. – 28 с. Отдельные оттиски из № 113, 114, 128 “Вит. губ. вед.”.

9. *Щеглов, И.* К 100-летию Витебского духовного училища / И.Щеглов. – Витебск, 1911.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ